университетом Берлина, Центром изучения международной торговли и безопасности университета штата Джорджия (США), рядом польских университетов.

Особое значение коллектив преподавателей и студентов факультета придает идеологической работе. Как отметил глава нашего государства, «общество не может существовать без целостного свода идей, ценностей и норм, объединяющих всех граждан. Государство без идеологии, как и человек без мысли, не может развиваться, тем более противостоять внутренним и внешним угрозам и вызовам». Беларуси нужны дипломаты, преданные своей стране и уважающие историю и ценности своего народа. Для реализации поставленных руководством страны задач, мы используем различные формы и методы воспитания. В частности, широко практикуются встречи студентов и преподавателей с представителями министерств и ведомств, деятелями науки и культуры, работниками дипломатических представительств, аккредитованных в Беларуси. В рамках идеологической работы осуществляется поддержка дискуссионных клубов и различных социальных проектов.

Таким образом, стратегия факультета международных отношений Белгосуниверситета состоит в том, чтобы постоянно совершенствовать методическую и профессиональную подготовку профессорско-преподавательского состава, научную работу и на этой основе повышать качество подготовки специалистов дипломатического корпуса нашей страны, отвечающей всем современным требованиям.

## ДЗЕЙНАСЦЬ УРАДА БНР ПА ВЫРАШЭННІ ПРАБЛЕМЫ БЕЖАНЦАЎ

*Саматыя В.Р.*, Беларускі дзяржаўны універсітэт

Вырашэнне праблем бежанцаў не засталося па-за увагай урада Беларускай Народнай Рэспублікі, абвешчанай у сакавіку 1918 года. Планамерная арганізацыя вяртання бежанцаў у родныя мясціны, папярэджанне эпідэмій і аднаўленне разбураных вайной гаспадарак – усе гэтыя праблемы імкнуліся па магчымасці вырашаць Народны Сакратарыят і рада БНР. Першыя крокі ў гэтым накірунку былі зроблены Народным Сакратарыятам ўжо ў красавіку 1918 года. Так, 12 красавіка 1918 г. Народны Сакратарыят накіраваў ліст Віленскаму Таварыству дапамогі пацярпелым ад вайны (якое дзейнічала з красавіка 1915 г.). У лісце ўтрымлівалася прапанова звярнуцца да нямецкіх акупацыйных уладаў па вырашэнні пытання аб найхутчэйшым вяртанні бежанцаў-беларусаў дадому. 17 красавіка 1918 г. Народны Сакратарыят накіраваў у Гомель, дзе на той час знаходзілася вялікая колькасць бежанцаў-яўрэяў з Заходняй Беларусі, свайго прадстаўніка Язэпа Гуміна, «... дзеля свядомасці аб палажэнні жыдоў-бежанцаў». У маі 1918 г. пры Народным Сакратарыяце была створана спецыяльная структура, якая займалася вырашэннем бежанскай праблемы – Камісія па справах бежанцаў. У яе склад увайшлі ксёндз В. Гадлеўскі, Ст. Лянкоўскі, П. Бадунова, П. Бартош, А. Прыстор.

Для ўрэгулявання бежанскага пытання 5 чэрвеня 1918 г. Камісія па справах бежанцаў пасылае сваіх упаўнаважаных у месцы канцэнтрацыі бежанцаў. Так, у Петраград, Маскву, Віцебск і Смаленск быў накіраваны Яфім Бялевіч, а ў Баранавічы, Сіняўку, Замір'е і Мір – Уладзімір Грамякоў. 8 чэрвеня 1918 г. дзеля каардынацыі дзейнасці з Віленскім таварыствам дапамогі пацярпелым ад вайны ў справе вяртання бежанцаў быў накіраваны Эдвард Будзька. На дапамогу яму Народным Сакратарыятам 20 ліпеня 1918 г. у Вільню быў камандзіраваны Станіслаў Мураўскі.

Паштовы чыноўнік Мінскага Чыгуначнага Аддзялення Часлаў Камарніцкі 25 чэрвеня 1918 г. быў накіраваны Народным Сакратарыятам у горад Арол. Яму даручылі правесці рэгістрацыю ўсіх чыноўнікаў, якія выказалі жаданне вярнуцца на бацькаўшчыну. Для таго, каб вярнуць сваю коркавую фабрыку «Мураванка», на Случчыну выязджаў у Арол Альгерд Яленскі.

Справавод Мінскай класічнай мужчынскай гімназіі Іван Шастак выехаў у Маскву для рээвакуацыі гэтай навучальнай установы ў Мінск. 2 ліпеня 1918 г. да старшыні Народнага Сакратарыята звярнуўся намеснік старшыні Настаўніцкага інстытута Язэп Каранеўскі з просьбай перавесці гэтую навучальную ўстанову разам са 150 слухачамі і выкладчыкамі з Яраслаўля ў Мінск. У жніўні 1918 г. Рада БНР атрымала ад нямецкіх уладаў дазвол на вяртанне інстытута на Беларусь. У верасні прадстаўнікі інстытута займаліся пошукамі неабходнага памяшкання, і неўзабаве інстытут аднаваіў сваю дзейнасць у Мінску.

У пачатку ліпеня 1918 г. у Народны Сакратарыят наведваюцца прадстаўнікі беларусаў-бежанцаў. Так, дэлегат бежанцаў-гродзенцаў, якія апынуліся ў Екацярынаславе, В.Н. Астроўскі прыехаў са спецыяльным даручэннем – даследаваць памеры разбурэння вайной Гродзенскай губерні.

Гэта было выклікана тым, што каля 200 000 бежанцаў-беларусаў пры пасрэдніцтве украінскага ўрада збіраліся вярнуцца ў родныя мясціны.

У ліпені 1918 г. наведаў Мінск дэлегат беларусаў-бежанцаў Беластока І.Т. Жылкевіч. Бежанцы з Беласточчыны знаходзіліся ў той час у Віцебску і хацелі даведацца пра ўмовы вяртання на радзіму. Для вырашэння дадзенага пытання І. Т. Жылкевіч прыняў удзел у працы камісіі па справах бежанцаў Народнага Сакратарыята.

Вялікая колькасць беларусаў-бежанцаў Менскай губерні знаходзілася ў Гомелі. Упаўнаважаны Народнага Сакратарыята па рээвакуацыі бежанцаў П.В. Каранкевіч тэрмінова выехаў з Гомеля ў Мінск для вырашэння пытання іх вяртання.

Даволі вялікая колькасць беларусаў у час вайны апынулася на Украіне. Беларуская арганізацыя ў Кіеве заснавала аддзел дапамогі бежанцам і рэгістрацыйнае бюро для беларусаў. Даволі актыўна працаваў беларускі бежанскі камітэт у Адэсе. У чэрвені 1918 г. на рахунку гэтай арганізацыі было 240 000 рублёў, што дазваляла арганізацыі вырашаць многія складаныя праблемы бежанцаў. У ліпені 1918 г. на Украіне быў прыняты закон аб грамадзянстве. У сувязі з гэтым вялікая колькасць беларусаў у Адэсе падала ў беларускае консульства заявы аб тым, што яны лічаць сябе грамадзянамі БНР. Так, беларускае консульства ў Адэсе зарэгістравала каля 16 000 беларусаў. 17 ліпеня 1918 г. Фёдарам Мазалевічам было заснавана Беларускае бежанскае рэгістрацыйнае бюро ў Палтаве.

Для перасылкі на радзіму беларусаў-бежанцаў Народны Сакратарыят прызначыў сваім упаўнаважаным на Каўказе Аляксандра Вальковіча. 26 кастрычніка 1918 г. упаўнаважаным па справах бежанцаў Радай БНР быў накіраваны ў Екацярынаслаў П. В. Мінкоў.

Камісіі па бежанскіх справах пры Радзе БНР 4 ліпеня 1918 г. Народным Сакратарыятам было асігнавана 500 рублеў для аказання дапамогі дзіцячаму атраду і прытулкам, а старшыні бежанскага камітэта Навуму Козічу на арганізацыйныя расходы аршанскага бежанскага камітэта – 1000 рублёў.

Камісія па справах бежанцаў, якую ў пачатку ліпеня 1918 г. узначаліў Янка Серада, выйшла з прапановай да германскага камандавання пра хутчэйшае вырашэнне пытання аб вяртанні бежанцаў. Нямецкія ўлады пайшлі насустрач Народнаму Сакратарыяту ў вырашэнні праблемы бежанцаў. Так, 11 ліпеня 1918 г. Янка Серада атрымаў паведамленне наступнага зместу: «Пасля таго, як Галоўнакамандуючы дазволіў заснаваць Беларускую камісію пры Германскім камісары па справах бежанцаў у Оршы, для хутчэйшага вяртання бежанцаў на радзіму, прашу Вас у самы кароткі час скласці спіс асоб, з якіх будзе складацца гэтая камісія». 16 ліпеня прадстаўніку нямецкіх уладаў Шрэдэру быў накіраваны адказ, што 13 ліпеня 1918 г. была створана камісія ў наступным складзе: Н.І. Танана, С.М. Бардовіч, Г.Я. Сурба. Такім чынам, справа па вяртанні бежанцаў пачала паступова вырашацца ва ўзаемадзеянні з нямецкімі ўладамі.

Пазіцыя нямецкіх уладаў тлумачылася ў гэтым пытанні двума асноўнымі абставінамі: пагрозай эпідэмій у бежанскім асяроддзі і пагрозай распаўсюджання бальшавіцкай прапаганды. У жніўні 1918 г. бежанская камісія Рады БНР прыняла пастанову: прасіць у нямецкіх улад дазволу накіраваць сваіх прадстаўнікоў у наступныя бежанскія пункты: Баранавічы, Маладзечна, Гомель, Магілёў. Намаганні камісіі далі свой плён. У верасні нямецкія ўлады прапанавалі бежанскай камісіі накіраваць аднаго са сваіх членаў для сумеснага абмеркавання шэрагу пытанняў па рээвакуацыі бежанцаў. Камісія Рады для гэтага камандзіравала Навума Козіча. Пры сумесным абмеркаванні былі станоўча вырашаны многія пытанні, камісія атрымала дазвол адкрыць эвакуацыйнае бюро ў Мінску на Аляксандраўскім вакзале. Намаганнямі Народнага Сакратарыята была дасягнута дамоўленасць з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі аб тым, што першая партыя бежанцаў, якія знаходзіліся ў Мінску (каля 50 тысяч), будзе адпушчана на радзіму – у заходнюю частку Беларусі – праз Баранавічы, Маладзечна і Вільню. У кастрычніку 1918 г. толькі праз Баранавічы вярнуліся ў свае родныя мясціны больш за 4 тысячы беларусаў-уцекачоў.

Трэба адзначыць, што вырашаліся пытанні не толькі бежанцаў-беларусаў. Так, у лісце сябра Ратамскай беларускай Рады ксяндза М. Русецкага Народнаму Сакратарыята БНР за 2 лістапада 1918 г. паведамлялася аб адпраўцы апошніх літоўскіх бежанцаў з Ратамкі на бацькаўшчыну 2 ліпеня 1918 г.

Такім чынам, на працягу 1918 г. Народным Сакратарыятам і Радай БНР былі зроблены даволі істотныя ва ўмовах вайны практычныя крокі на шляху вырашэння бежанскага пытання. У гэтым знайшла адлюстраванне нацыянальная накіраванасць палітыкі ўрада БНР. Аднак сродкі для выканання запланаваных мерапрыемстваў былі вельмі абмежаваныя. Рэальная ўлада ў гэты час знаходзілася ў германскіх акупацыйных структурах, якія з падазронасцю адносіліся да ўрада БНР і жадалі выкарыстаць яго для ўмацавання свайго пануючага становішча ў Беларусі. Наогул, дапамога бежанцам у гэты час праходзіла ў абстаноўцы неадрэгуляванасці міжнароднага правапарадку і насіла несістэмны характар, ажыццяўлялася пад уплывам абставін.